# ”Мой родны кут, як ты мне мілы…“

Кавалёва Ясміна
ДУА ”Студзёнкаўская сярэдняя школа
імя П.Л.Бабака Сенненскага раёна“
6 клас

Радзіма… Як шмат значыць гэтае слова для мяне. Гэта і родныя, знаёмыя краявіды, і працавітыя, цікавыя, мужныя і сціплыя людзі, і мілагучная матчына мова, і клёкат буслоў…

Гэта зямля, на якой размешчаны і мой родны куток – вёска Студзёнка.

За што я люблю сваю вёску? Адразу адказаць на пытанне, думаю, здолее не кожны. Як родную вёску можна любіць за нешта канкрэтнае? Я нарадзілася ў ёй: першы крок, першае слова, першая сняжынка, мой першы Дзень ведаў. Усе дарогі, звязаныя з дарагімі сэрцу ўспамінамі, вядуць менавіта сюды, у Студзёнку. І ў першую чаргу я люблю сваю вёску за тое, што яна… мая. Родныя, любыя, дарагія сэрцу мясціны… Мне здаецца, што ведаю тут практычна кожны куток, кожны непрыкметны домік.

Вёска знаходзіцца на беразе маляўнічага возера Бярозаўскага. Казачныя краявіды кранаюць душу кожнага. Гэта ўлюбёнае месца адпачынку не толькі мясцовых жыхароў, але і гасцей. Сапраўды, можна гадзінамі сядзець на беразе і глядзець, як цягнуцца высока-высока над галавою белыя, пушыстыя аблокі. А паветра? Якое свежае і насычанае травамі! Яркія фарбы прыроды ўперамешку з салодкімі пахамі – ні з чым непараўнальнае задавальненне.

Мая вёска, як нейкая жывая істота, мае свой асабісты ўнутраны свет, які напоўнены людзьмі, якія з году ў год укладаюць у яго душу.

Ну і што, калі ў вёсцы няма высокіх шматпавярховых будынкаў, але яна захоўвае ў сабе часціцы і душы сваіх жыхароў, стваральнікаў, якія, быццам мастакі, дасканала прадумваюць кожны свой крок і берагуць сваю працу, сваё тварэнне. Прайдзіцеся па вуліцах вёскі летам – і галава закружыцца ад водару кветак, якія раскашуюць у агародчыках і палісадніках рупных гаспадынь. Што ні дом, то – шэдэўр. Я люблю летняй раніцай выйсці ў сад: сядзіш – цішыня, пакой. Разумею, што маё сэрца заўсёды будзе належыць гэтаму месцу.

Мая вёска заслугоўвае павагі, бо яе гісторыя сведчыць аб подзвігу народа, прапітана мужнасцю, смеласцю і самаадданасцю.

Тут дваццаць пятага чэрвеня тысяча дзевяцьсот сорак чацвёртага года прыняў свой апошні бой Герой Савецкага Саюза Міхаіл Аляксандравіч Анiскін, камандзір танка разведвальнага ўзвода. Сустрэўшы адступаючую калону ворага, якая спрабавала заняць абарону, уступілі ў няроўны бой. З першага выстрала танкісты разбілі галоўную машыну, аўтакалона звярнула з дарогі і затрымалася ў балоце. Немцы разбегліся. Больш за паўсотню нямецкіх салдат і афіцэраў загінула. Апошнім у гэтым баі паў і гвардыі лейтэнант Аніскін М.А. Танкісты пахавалі героя на месцы гібелі. Званне Героя Савецкага Саюза Міхаілу Аляксандравічу Аніскіну прысвоена пасмяротна. Імя героя прысвоена піянерскай дружыне нашай школы, яго

іменем названа цэнтральная вуліца вёскі Студзёнка. Даглядаючы помнік на месцы гібелі героя, мы аддаём даніну павагі тым, хто загінуў пры вызваленні нашай зямлі ад акупантаў.

Адной з памятных  мясцін на тэрыторыі Студзёнкаўскага сельскага савета з’яўляецца былая вёска Купавац, якую Канстанцін Заслонаў, камандзір партызанскага атрада, называў ”партызанскай сталіцай“ і ўсімі сіламі імкнуўся не аддаць ворагу. У вёсцы размяшчаўся штаб партызанскіх атрадаў, які кіраваў баявымі дзеяннямі партызанскіх атрадаў, размешчаных у Аршанскім, Бешанковіцкім, Ліёзненскім, Дубровенскім, Талачынскім і Чашніцкім раёнах. Жорсткі бой завязаўся пад Купаваццю ў тысяча дзевяцьсот сорак другім годзе і працягваўся пяць гадзін. У гэтым баі былі вялікія страты, як з боку партызан, так і з боку немцаў. Загінуў і Канстанцін Заслонаў, якому пасмяротна было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Зараз мемарыяльны комплекс ”Купавац“ прадстаўляе сабой тэрыторыю, на якой размешчана брацкая магіла, дзе пахаваны воіны і партызаны, ”абсталяваны“ партызанскі лагер, маецца сімвалічны фундамент, які напамінае пра дамы. Аформлена зона адпачынку, якая дазваляе ў цішыні ўдыхнуць нотку гісторыі, паразважаць, якой цаной дасталася Перамога. Гэта трэба ведаць не толькі для таго, каб пакланіцца сіле духу і мужнасці абаронцаў Радзімы, але і для таго, каб прыняць ад іх эстафету адказнасці за лёс сваёй краіны і будучых пакаленняў.

Я з упэўненасцю магу сказаць, што люблю свой родны кут. Калі  куды-небудзь выязджаю ў госці, то адразу пачынаю сумаваць па сваёй малой радзіме. Гэта асабліва востра адчуваю пры вяртанні – з нецярпеннем чакаю, калі з’явяцца родныя пейзажы, запахне роднай зямлёй, з’явяцца за акном знаёмыя твары мясцовых жыхароў.

Мне хацелася б, каб у жыцці кожнага з нас ніколі не надыходзіла тая сумная часіна, якая адарвала б нас ад роднай зямлі, каб радасць адзінства з радзімай заўсёды жыла ў нашых душах. Каб кожны з нас разумеў, што будучае малой радзімы залежыць ад нас.